УДК 94(476) «1940/1980» DOI 10.63874/2218-0281-2026-1-25-31

***Вікторыя Алегаўна Баран***
*аспірант 2-га года навучання каф. гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Victoria Baran***
*2-nd Year Postgraduate Student*
*of the Department of History of Belarus and Special Historical Disciplines*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: victoriabaran@yandex.by

# КАЛЕКТЫЎНЫ ПАРТРЭТ ВЕТЭРАНАЎ КПЗБ ЯК САЦЫЯЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX ст.

*На падставе шырокага кола крыніц складзены і прааналізаваны калектыўны партрэт ветэранаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) як сацыяльнай супольнасці ў БССР у другой палове XX ст. Даследаванне прадметна скіравана на біяграфічныя звесткі ветэранаў КПЗБ, якія ўключаюць іх сацыяльнае паходжанне, узровень адукацыі, знаходжанне ў бежанстве падчас Першай сусветнай вайны, удзел у нацыянальна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. і Вялікай Айчыннай вайне; прасочваецца абумоўленасць траекторыі іх узыходжання па кар'ернай лесвіцы ў другой палове XX ст. Матэрыялы і высновы артыкула могуць быць выкарыстаны як пры далейшым вывучэнні як міжваеннай гісторыі Заходняй Беларусі, так і падчас даследавання сацыяльна-палітычнай гісторыі БССР другой паловы XX ст., а таксама пры падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў, лекцыйных курсаў і абагульняльных прац па навейшай гісторыі Беларусі.*

***Ключавыя словы:*** *Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг., ветэраны КПЗБ, нацыянальна-вызваленчы рух, Вялікая Айчынная вайна, калектыўны партрэт, сацыяльная супольнасць, успаміны.*

## *Collective Portrait of Veterans of the CPZB as a Social Community in the BSSR in the Second Half of the XX Century*

*On the basis of a wide range of sources, a collective portrait of veterans of the Communist Party of Western Belarus (CPZB) as a social community in the BSSR in the second half of the 20th century was compiled and analyzed. The research is focused on the biographical data of the KPZB veterans, including their social origin, education level, refugee status during the First World War, participation in the national liberation movement in Western Belarus in 1921–1939, in the Great Patriotic War, and the conditionality of their career trajectory in the second half of the twentieth century. The materials and conclusions of the article can be used in further study of both the interwar history of Western Belarus and the socio-political history of the BSSR in the second half of the twentieth century, in the preparation of textbooks, lecture courses and generalizing works on the modern history of Belarus.*

***Key words:*** *Western Belarus in 1921–1939, KPZB veterans, the national liberation movement, the Great Patriotic War, collective portrait, social community, memories.*

**Уводзіны**

Уваходжанне Заходняй Беларусі ў склад БССР у верасні 1939 г. было пераломным момантам у гісторыі Беларусі і беларускага народа.

Гэты працэс суправаджаўся складанымі сацыяльна-палітычнымі трансфармацыямі, у якіх значная роля належала ветэранам рэвалюцыйнага руху – былым членам КПЗБ, якія прайшлі школу падпольнай барацьбы і рэпрэсій, а затым, у савецкі перыяд, сталі часткай партыйна-дзяржаўнай наменклатуры і захавальнікамі памяці пра змаганне супраць польскай акупацыі «за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз'яднанне беларускага народа ў адзінай сацыялістычнай дзяржаве» і супраць нямецка-фашысцкай агрэсіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Мэта артыкула – на аснове аналізу сацыяльна-дэмаграфічных і грамадска-палітычных паказчыкаў скласці і ахарактарызаваць калектыўны партрэт ветэранаў КПЗБ як сацыяльнай супольнасці, якая сфарміравалася ў БССР у другой палове XX ст.

---

*Навуковы кіраўнік – Аляксандр Аляксандравіч Савіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*

У аснову фарміравання калектыўнага партрэта адзначанай сацыяльнай супольнасці мэтазгодна паставіць вызначальныя паказчыкі асабістага жыцця і палітычнай біяграфіі былых рэвалюцыянераў Заходняй Беларусі: сацыяльнае паходжанне, маёмасны і адукацыйны цэнз, прафесійны статус, матывацыю ўступлення ў камсамол і кампартыю Заходняй Беларусі, удзел у нацыянальна-вызваленчым руху ў 1921–1939 гг., стаўленне да рэпрэсій у дачыненні да КПЗБ і яе членаў, удзел у сацыялістычных пераўтварэннях пасля 1939 г. і Вялікай Айчыннай вайне, а таксама ў грамадска-палітычных і культурных працэсах БССР у другой палове XX ст.

**Асноўная частка**

Крыніцазнаўчую аснову даследавання склалі апублікаваныя ў зборніках успамінаў і захоўваемыя ў розных архівах Беларусі аўтабіяграфіі ветэранаў КПЗБ. Усяго было апрацавана 50 біяграфій ветэранаў КПЗБ.

Аналіз выяўленых крыніц даў падставы для высновы, што значная частка ветэранаў КПЗБ паходзіла з сялянскага асяроддзя: С. В. Прытыцкі, М. С. Арэхва, М. Е. Крыштафовіч, А. Р. Свяргун, Р. І. Сяржант, У. П. Гуль, З. Ф. Паплаўскі, У. З. Царук, В. П. Ласковіч, П. С. Крынчык, П. С. Пестрак, М. Танк, Я. Г. Міско, В. С. Селівонік, А. К. Счасная, А. І. Федасюк і інш. У цэлым можна пераканаўча сцвярджаць пра сялянскі фактар як вызначальную рысу камуністычнага руху Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. з рэзка адмоўным успрыняццем беларускімі сялянамі гвалтоўна навязанай польскай акупацыйнай улады, якая несправядліва ўзяла кантроль над асноўным багаццем краю – зямлёй. Гэтая акалічнасць ва ўмовах аграрнай перанаселенасці заходнебеларускай вёскі, буйнога памешчыцага землеўладання, насаджэння асадніцтва і правядзення ў цэлым аграрных пераўтварэнняў не на карысць сялянства ўплывала на яго палітызацыю і актывізацыю як галоўную сілу вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі супраць польскай улады [1, с. 15].

Так, яркім прадстаўніком супольнасці ветэранаў КПЗБ з’яўляецца Сяргей Восіпавіч Прытыцкі, які нарадзіўся у 1913 г. у в. Гаркавічы Сакольскага павета Гродзенскай губерні (цяпер тэрыторыя Польшчы) у беднай сялянскай сям’і.

Ва ўспамінах С. В. Прытыцкі акцэнтуе ўвагу на неспрыяльным матэрыяльным становішчы сваёй сям’і ва ўмовах знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы, абумоўленым малым зямельным надзелам (1,5 дзесяціны), адсутнасцю свайго дома, сродкаў для існавання і вялікай колькасцю ўтрыманцаў (8 чалавек). Гэтыя абставіны прадвызначылі ранні пачатак працоўнай дзейнасці С. В. Прытыцкага – батрацтва і цяжкая праца на тартаку [2, арк. 1; 3, с. 263].

Пэўная частка ветэранаў КПЗБ была выхадцамі з сем’яў рабочых, рамеснікаў і служачых, што адлюстроўвала сацыяльную структуру рэгіёна. Так, з рабочага асяроддзя выйшлі Л. Р. Шайкоўскі, Ф. Б. Пірышка, І. Г. Бернштэйн, А. І. Багданчук, з сем’яў рамеснікаў – Ф. А. Цыгельніцкая, Г. М. Муха-Мухноўскі і А. Б. Гендлер; да служачых належалі бацькі Д. І. Розенштэйна і Ц. І. Гурвіч.

Агульным для ветэранаў КПЗБ было цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча і адчуванне несправядлівасці, што прыводзіла да фарміравання пратэсных настрояў і прыцягвала ў шэрагі камуністычнага руху [4].

Першая сусветная вайна стала каталізатарам маштабных сацыяльна-палітычных трансфармацый і негатыўна паўплывала на лёсы мільёнаў людзей. Тэрыторыя Беларусі знаходзілася ў эпіцэнтры ваенных дзеянняў, зведала значныя разбурэнні і змены, якія абумовілі масавыя міграцыйныя працэсы. Бежанства ахапіла розныя пласты насельніцтва, у значнай ступені закранула і будучых ветэранаў КПЗБ, пераважная большасць успамінаў якіх ілюструе вопыт бежанства.

У якасці прыкладу, які паказвае ўплыў цяжкага перыяду жыцця бежанца на сацыяльны партрэт ветэранаў КПЗБ, з’яўляецца Мікалай Сямёнавіч Арэхва, чый жыццёвы шлях цесна звязаны з падзеямі Першай сусветнай вайны, польскай акупацыяй Заходняй Беларусі і наступнай барацьбой беларускага народа за незалежнасць і нацыянальную кансалідацыю [5, арк. 8; 6, с. 6].

Аналагічны вопыт вымушанага бежанства ў гады Першай сусветнай вайны атрымалі і іншыя вядомыя дзеячы КПЗБ: М. Е. Крыштафовіч, П. С. Пястрак, А. Р. Свергун, З. Ф. Паплаўскі, Я. І. Дабрыян, А. І. Багданчук, В. С. Селівонік, А. І. Федасюк [4].

Адукацыйны ўзровень дзеячаў КПЗБ быў розным. Члены партыі, якія паходзілі

з сялянскіх сем'яў, часцей за ўсё мелі пачатковую ці нясконччаную сярэднюю адукацыю. Гэта было звязана з абмежаванымі магчымасцямі атрымання сістэмнай адукацыі для прадстаўнікоў гэтых сацыяльных слаёў ва ўмовах знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Напрыклад, у маі 1926 г. С. В. Прытыцкі завяршыў навучанне ў трохкласнай школе. Паводле ўспамінаў яго сястры Іраіды Восіпаўны Царук, ён дэманстраваў высокую паспяховасць і выказваў намер працягнуць адукацыю ў Віленскай гімназіі [7, с. 32]. Увядзенне платы за навучанне ў гімназіях на тэрыторыі Польшчы стала істотным бар'ерам для атрымання адукацыі. Пераважная большасць насельніцтва Заходняй Беларусі заставалася непісьменнай, а фінансавыя абмежаванні сям'і не дазволілі С. В. Прытыцкаму працягнуць навучанне ў гімназіі [8, арк. 5].

Іншы прыклад вядомы з аўтабіяграфіі Ф. Д. Кавалеўскага, які прыступіў да вучобы ва ўзросце дзевяці гадоў. Яго навучальны год, абумоўлены гаспадарчымі патрэбамі сям'і, быў абмежаваны зімовымі месяцамі па прынцыпе «ад снегу да травы»: з выпадзеннем снегу ён прыступаў да заняткаў, а з яго зыходам пакідаў школу для выпасу жывёлы. Такім чынам, агульная працягласць яго навучання склала не тры гады, а толькі тры зімовыя сезоны.

Адукацыйны вопыт С. В. Прытыцкага і Ф. Д. Кавалеўскага паказвае агульную заканамернасць, уласцівую лёсу многіх ветэранаў КПЗБ: іх шлях да ведаў перарываўся як з-за платнага характару сярэдняй адукацыі, што было магутным сацыяльным фільтрам, так і па прычыне эканамічных абставінаў сем'яў, што знаходзіць пацвярджэнне ў біяграфіях А. К. Счаснай, В. Ф. Валейка, Т. А. Стэльмашука і шэрага іншых выхадцаў з сялянскага асяроддзя.

Адзначым, што на павышэнне адукацыйнага ўзроўню членаў КПЗБ уплывала іх палітычная дзейнасць – г. зв. «турэмныя ўніверсітэты», а таксама навучанне ў Мінскай школе КПЗБ і Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцей Захаду імя Ю. Мархлеўскага ў Маскве, праграмы якіх былі нацэлены на фарміраванне прафесійных рэвалюцыянераў.

У другой палове XX ст. назіраўся рост колькасці ветэранаў КПЗБ, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, сярод іх С. В. Прытыцкі, В. П. Ласковіч, І. В. Малец, А. Л. Каханоўскі, Я. Г. Міско і інш. [4]. Гэта было шмат у чым абумоўлена палітыкай партыі і дзяржавы па падрыхтоўцы кадраў. Часцей за ўсё іх спецыялізацыя была звязана з партыйным будаўніцтвам, народнай гаспадаркай, адукацыяй, а таксама прапагандай і агітацыяй. Савецкая ўлада актыўна прасоўвала «вылучэнцаў» з рабочага і сялянскага асяроддзя, даючы ім магчымасці для навучання і кар'ернага росту.

Важным чыннікам вызначэння месца ў іерархіі ветэранаў КПЗБ быў іх партыйны статус у 1920–1930-я гг., а менавіта заняцце імі адпаведных кіруючых пасад. Найбольшым аўтарытэтам карысталіся тыя, хто займаў кіруючыя пасады ў партыйнай структуры ЦК КПЗБ і КСМЗБ, сакратароў акруговых і раённых камітэтаў. Гэтыя пасады забяспечвалі непасрэднае кіраўніцтва падпольнай працай, ідэалагічную падрыхтоўку кадраў і каардынацыю дзейнасці на месцах. Займаючы гэтыя пазіцыі, ветэраны КПЗБ і КСМЗБ аказвалі значны ўплыў на прыняцце рашэнняў і рэалізацыю тактыкі рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Так, М. С. Арэхва са студзеня 1925 г. да сакавіка 1926 г. быў кіраўніком акруговых камітэтаў (АК) КПЗБ у Гродне і Вільні і адначасова быў членам ЦК КПЗБ. У 1934–1935 гг. ён узначальваў Краёвы сакратарыят ЦК КПЗБ [5, арк. 8–9]. У маі 1935 г. М. С. Арэхва прыняў удзел у II з'ездзе КПЗБ, дзе выступіў з дакладам аб задачах партыі ў нацыянальна-вызваленчым руху і быў выбраны членам ЦК КПЗБ [6, с. 199]. З ліпеня 1936 г. да канца лістапада 1939 г. ён быў прадстаўніком ЦК КПЗБ пры арганізацыйным апараце ЦК Кампартыі Польшчы ў Празе [5, арк. 9].

Ф. А. Цыгельніцкая ў 1930-я гг. таксама ўваходзіла ў склад кіруючых органаў КПЗБ – часовага сакратарыята ЦК і краёвага сакратарыяту, была ўпаўнаважаным ЦК па Віленскай акрузе [9, с. 25].

Д. І. Розенштэйн з 1925 г. – сакратар Віленскага гаркама, Гродзенскага АК КПЗБ, а з 1927 г. – член Цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ [4, арк. 180].

Дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху дэманстравалі высокую ступень партыйнай дысцыпліны і падпарадкавання кіраўніцтву КПЗБ, Кампартыі Польшчы (КПП) і Камінтэрна. Ва ўмовах складанай

аператыўнай абстаноўкі заходнебеларускага падполля яны выконвалі шырокае кола важных партыйных даручэнняў.

Яркай ілюстрацыяй мэтанакіраванай і сістэматычнай палітыкі сталінскай рэпрэсіўнай машыны ў адносінах да былых арганізатараў і ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. стаў роспуск рашэннем Камінтэрна ў 1938 г. КПЗБ як часткі КПП.

Ацэнка рэпрэсіўных мер у дачыненні да ветэранаў КПЗБ у канцы 1930-х гг. і роспуску партыі з'яўляецца адным з ключавых фактараў, якія характарызуюць як усю даследуемую групу, так і асобных яе членаў. Варта падкрэсліць неаднароднасць успрымання гэтых падзей у асяроддзі былых членаў КПЗБ. Не ўсе ветэраны партыі ў сваіх мемуарах і аўтабіяграфіях акцэнтавалі ўвагу на рэпрэсіях – толькі частка былых партыйцаў (І. С. Сідарук, Т. А. Бурава, П. С. Крынчык, А. К. Лябецкая, Г. М. Муха-Мухноўскі, М. А. Клінцэвіч, К. М. Такушэвіч, С. А. Жабінскі) згадвае пра іх. У якасці прыкладу можна прывесці аўтабіяграфію М. С. Арэхвы, у якой ён, акрамя акцэнтацыі ўвагі на жорсткасці неабгрунтаваных рэпрэсій у дачыненні да КПЗБ і яе членаў, згадвае і асабістую трагедыю: яго жонка Алена Смірніцкая (Ваяводская) была арыштавана органамі НКУС і расстраляна, а дачка аддадзена ў дзіцячы дом [5, арк. 11].

Многія ветэраны КПЗБ прымалі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне, змагаючыся як у партызанскіх атрадах, так і на фронце, дзе праяўлялі адданасць савецкай уладзе і гераізм у барацьбе за свабоду і незалежнасць сваёй краіны. З ліку найбольш актыўных удзельнікаў партызанскага руху з ветэранаў КПЗБ адзначым двух Герояў Савецкага Саюза – У. З. Царука і Ф. Р. Маркава, а таксама С. В. Прытыцкага, М. С. Арэхву, В. Е. Самуціна, М. Е. Крыштафовіча, М. Т. Анішчыка, З. Ф. Паплаўскага, А. І. Федасюк, Д. І. Розенштэйна, В. П. Ласковіча, В. С. Селівонік, С. П. Пацяруху, В. В. Янушку [10, арк. 78]. Важнасць уліку ўдзелу ветэранаў КПЗБ як асобнай грамадска-палітычнай супольнасці ў падпольным і партызанскім змаганні ў гады Вялікай Айчыннай вайны абумоўлена багатым вопытам іх мінулага ў складзе рэвалюцыйнага падполля Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг., які быў выкарыстаны савецкім ваенным кіраўніцтвам для арганізацыі ўзброенай барацьбы супраць нямецка-фашысцкай агрэсіі на тэрыторыі Беларусі і Польшчы.

Вядома, што ў пасляваенныя гады асноўнай крыніцай кадравага рэзерву для папаўнення партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў былі камандзіры і камісары партызанскіх атрадаў [11, с. 170]. Яны выбіраліся ў мясцовыя саветы дэпутатаў, а некаторыя – у Вярхоўны Савет БССР (С. В. Прытыцкі, Максім Танк, А. І. Федасюк, А. К. Счасная, В. Ф. Валейка і інш.), займалі пасады ў партыйных камітэтах розных узроўняў [4]. У другой палове XX ст. ветэраны КПЗБ адыгрывалі важную ролю ў грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай сферах БССР. Яны займалі кіруючыя пасады ў партыйных і дзяржаўных органах, удзельнічалі ў рэалізацыі сацыяльна-эканамічнай палітыкі, займаліся ідэйна-патрыятычным выхаваннем моладзі. Так, у 1944 г. М. Е. Крыштафовіч займаў пасаду старшыні Пружанскага райвыканкама, у 1947–1961 гг. быў старшынёй і намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама, у 1949–1952 гг. быў кандыдатам у члены ЦК КП(б)Б; у 1952–1960 гг. – член ЦК КПБ, у 1946–1958 гг. – дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, у 1951–1955 гг., у 1959–1963 гг. – Вярхоўнага Савета БССР, у 1951–1955 гг. – намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР [12, с. 641; 13, с. 163].

З. Ф. Паплаўскі з 1946 г. працаваў у Брэсцкім абкаме партыі інструктарам па апеляцыі, з 1953 г. быў членам партыйнай камісіі [4, арк. 164; 14, арк. 20].

На гэтых пасадах яны, як і іншыя ветэраны, унеслі значны ўклад у грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове XX ст.

Ветэраны КПЗБ актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці, працавалі ў прафсаюзных і ветэранскіх арганізацыях, музеях (В. С. Селівонік і В. П. Ласковіч). Выкарыстоўваючы розныя формы працы з насельніцтвам краіны (публічныя выступленні, лекцыі, сустрэчы, удзел у грамадскіх мерапрыемствах), ветэраны імкнуліся сфарміраваць у моладзі патрыятычныя ідэалы і каштоўнасці, заснаваныя на камуністычнай ідэалогіі і дасягненнях савецкай дзяржавы. Іх дзейнасць спрыяла фарміраванню ў моладзі

камуністычнага светапогляду, пачуцця гонару за сваю краіну і гатоўнасці да абароны сацыялістычных дасягненняў.

Многія ветэраны, атрымаўшы педагагічную адукацыю, працавалі ў сістэме адукацыі: Ц. І. Гурвіч, А. Л. Каханоўскі, Р. А. Пірышка, С. А. Жабінскі, І. В. Малец і інш. [4]. Яны не толькі перадавалі веды, але і фарміравалі ў вучняў камуністычны светапогляд, распавядалі пра гераічную класавую барацьбу КПЗБ супраць польскай улады ў 1921–1939 гг. і перавагі сацыялістычнага ладу.

Ветэраны КПЗБ, валодаючы значным вопытам і аўтарытэтам, актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі савецкай культурнай палітыкі ў БССР у другой палове XX ст. Дзейнасць народнага пісьменніка БССР Максіма Танка, пісьменнікаў, заслужаных дзеячаў культуры Беларусі П. С. Пестрака і Я. Г. Міско, якія ў міжваенны перыяд былі актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнага руху, спрыяла фарміраванню светапогляду маладога пакалення ў традыцыях адданасці камуністычным ідэалам і гераізацыі рэвалюцыйных падзей Заходняй Беларусі 1920–1930-х гг. [4].

Ветэраны КПЗБ адыгралі пэўную ролю і ў навукова-публіцыстычнай дзейнасці, прыклаўшы свае намаганні адлюстраванню гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., нацыянальна-вызваленчага руху, гісторыі КПЗБ [15, с. 28–34]. Аналіз гэтай працы ў кантэксце эпохі з улікам ідэалагічнай кан'юнктуры і даступных альтэрнатыўных крыніц дазваляе больш аб'ектыўна ацаніць гістарычныя працэсы, якія адбываліся ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., і пазбегнуць спрошчанага і аднабаковага разумення мінулага.

## Заключэнне

Калектыўны партрэт ветэранаў КПЗБ у другой палове XX ст. прадстаўлены ў асноўным выхадцамі з сялянскага асяроддзя, якія прайшлі праз выпрабаванні падпольнай барацьбы, захавалі вернасць камуністычным ідэалам і адаптаваліся да ўмоў савецкай рэчаіснасці. Перыяд бежанства, перажыты многімі ветэранамі КПЗБ у гады Першай сусветнай вайны, аказаў істотны ўплыў на фарміраванне іх сацыяльнага партрэта. Вымушаная міграцыя спрыяла глыбокай асабістай трансфармацыі, культурнай асіміляцыі, пашырэнню кругагляду і ў некаторых выпадках змене нацыянальнай ідэнтычнасці прадстаўнікоў даследуемай супольнасці. Драматычныя, а часам і трагічныя падзеі бежанства фарміравалі спецыфічны тып свядомасці, арыентаваны на пошук новай сацыяльнай апоры і радыкальныя палітычныя рашэнні. Падзеі Першай сусветнай вайны апасродкавана, праз механізм вымушанай міграцыі, сталі адной з умоў фарміравання той сацыяльнай базы, на якую пасля абапіраўся камуністычны рух у Заходняй Беларусі.

У перыяд знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы атрыманне сістэмнай адукацыі для выхадцаў з рабоча-сялянскага асяроддзя было істотна абмежавана шэрагам такіх структурных бар'ераў, як яе платны характар і эканамічная неабходнасць дзіцячай працы. Гэта прыводзіла да масавай непісьменнасці і фарміравала спецыфічны тып «перапыненай» адукацыі.

У пасляваенны перыяд адукацыйны ўзровень ветэранаў КПЗБ значна павысіўся ў выніку мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі па падрыхтоўцы партыйна-дзяржаўных кадраў. Такая трансфармацыя не толькі адлюстроўвае змены ў іх індывідуальным сацыяльным статусе, але і служыць яркай ілюстрацыяй інструментальнага падыходу савецкай улады да адукацыі як да ключавога рэсурсу фарміравання новай кіруючай эліты.

Іерархічнае становішча ветэранаў КПЗБ вызначалася іх партыйным статусам у 1920–1930-х гг. Ключавым крытэрыем выступала выкананне функцый кіруючых пасад у цэнтральным (ЦК КПЗБ, ЦК КСМЗБ), акруговым і раённым партыйных апаратах, што забяспечвала непасрэдны ўдзел у кіраўніцтве падпольнай дзейнасцю, ідэалагічнай працай і аператыўнай каардынацыяй на месцах. Вопыт арганізацыйна-распарадчай і палітычнай працы ва ўмовах падполля фарміраваў іх аўтарытэт і адпаведныя кампетэнцыі. Выкананне шырокага кола партыйных даручэнняў у складанай аператыўнай абстаноўцы камуністычнага падполля не толькі патрабавала высокай дысцыпліны і падпарадкавання цэнтральнаму кіраўніцтву, але і закладвала аснову для наступнага прызнання іх укладу ў нацыянальна-вызваленчы рух.

Такім чынам, партыйна-службовая пазіцыя, якую займалі падпольшчыкі ў міжваенны перыяд, уяўляла сабой не толькі элемент фармальнага статусу, але і фундаментальны фактар, які абумовіў становішча

і ступень грамадскага ўплыву ветэранаў КПЗБ у другой палове XX ст. Пры гэтым, заднаго боку, яны ганарыліся сваім мінулым, а з другога боку, з уключэннем у савецкі ідэалагічны кантэкст яны ў асноўным вымушаны былі замоўчваць некаторыя аспекты гісторыі іх партыі, найперш рэпрэсіі ў адносінах да КПЗБ. Фактычна роспуск КПЗБ стаў заканамерным наступствам палітыкі, якая характарызавалася недаверам і рэпрэсіўнымі мерамі ў дачыненні да былых членаў партыі. Таму дадатковым вызначальным аргументам грамадска-палітычнага прызнання ветэранаў КПЗБ стаў іх удзел у Вялікай Айчыннай вайне як лагічны працяг барацьбы ў складзе партызанскіх атрадаў, падпольных груп і на франтах за свабоду і незалежнасць Радзімы.

Ветэраны КПЗБ унеслі значны ўклад у грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё БССР у другой палове XX ст. Займаючы пасады ў партыйных і савецкіх органах (ад райвыканкамаў да Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР), яны забяспечвалі пераемнасць улады, трансляцыю цэнтралізаванай палітыкі на месцах і фарміраванне рэгіянальнай эліты. Яны выступалі ў якасці носьбітаў і транслятараў гістарычнай памяці пра барацьбу беларускага народа за незалежнасць і нацыянальную кансалідацыю ў 1921–1939 гг. і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Іх праца з моладдзю была інструментам фарміравання новай савецкай ідэнтычнасці. Як педагогі, пісьменнікі і рэдактары, яны ўплывалі на адукацыйны працэс і культурнае поле, фарміравалі інфармацыйную палітыку і ідэалагічны змест.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Савіч, А. Сялянскі фактар у дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі / А. Савіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2023. – № 11. – С. 9–16.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1354. Воп. 1. Спр. 81.
3. У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі / Ін-т гісторыі партыі ЦК КП Беларусі – філіял Ін-та марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС ; склад.: М. С. Арэхва [і інш.]. – Мн. : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 361 с.
4. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1099.
5. НАРБ. – Ф. 976. Воп. 1. Спр. 3.
6. Орехво, Н. С. Дела и люди КПЗБ : воспоминания / Н. С. Орехво. – Мн. : Беларусь, 1983. – 287 с.
7. Царюк, И. От родного порога / И. Царюк. – Мн. : БГУ, 2011. – 163 с.
8. НАРБ. – Ф. 1354. Воп. 1. Спр. 93.
9. Годы испытаний и мужества : сб. воспоминаний / сост.: Н. С. Орехво, Н. С. Сташкевич ; под ред. Н. Ф. Капич [и др.]. – Мн. : Беларусь, 1973. – 415 с.
10. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1101.
11. Очерки истории Брестской областной партийной организации / Я. Я. Алексейчик, Б. И. Камейша, В. П. Самович ; под общ. ред. В. А. Бобкова. – Мн. : Беларусь, 1989. – 448 с.
12. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Брэста : у 2 кн. / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелТА, 2001. – Кн. 2. – 641с.
13. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пружанскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. А. М. Хількевіч. – Мн. : БелЭн, 1992. – 245 с.
14. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 1. Воп. 26. Спр. 3113.
15. Савіч, А. А. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў. – Брэст, 2019. – 300 с.

## REFERENCES

1. Savich, A. Syalyanski faktar u dzeinastsi Kamunistychnai partyi Zakhodnyai Belarusi / A. Savich // Belaruski gistarychny chasopis. – 2023. – № 11. – S. 9–16.
2. Natsyyanal’ny arkhiu Respubliki Belarus’ (NARB). – F. 1354. Vop. 1. Spr. 81.

3. U surovyya gady padpollya: uspaminy bylykh chlenau KPZB – aktyunykh udzel’nikau revalyutsyinaga rukhu Zakhodnyai Belarusi / In-t gistoryi partyi TsK KP Belarusi – filiyal In-ta marksizmu-leninizmu pry TsK KPSS ; sklad.: M. S. Arekhva [i insh.]. – Mn. : Dzyarzh. vyd-va BSSR, 1958. – 361 s.

4. NARB. – F. 1440. Vop. 3. Spr. 1099.

5. NARB. – F. 976. Vop. 1. Spr. 3.

6. Orekhvo, N. S. Dela i lyudi KPZB : vospominaniya / N. S. Orekhvo. – Mn. : Belarus’, 1983. – 287 s.

7. Tsaryuk, I. Ot rodnogo poroga / I. Tsaryuk. – Mn. : BGU, 2011. – 163 s.

8. NARB. – F. 1354. Vop. 1. Spr. 93.

9. Gody ispytanii i muzhestva : sb. vospominanii / sost.: N. S. Orekhvo, N. S. Stashkevich ; pod red. N. F. Kapich [i dr.]. – Mn. : Belarus’, 1973. – 415 s.

10. NARB. – F. 1440. Vop. 3. Spr. 1101.

11. Ocherki istorii Brestskoi oblastnoi partiinoi organizatsii / Ya. Ya. Alekseichik, B. I. Kameisha, V. P. Samovich ; pod obshch. red. V. A. Bobkova. – Mn. : Belarus’, 1989. – 448 s.

12. Pamyats’: gistoryka-dakumental’naya khronika Bresta : u 2 kn. / redkal.: G. K. Kisyaleu (gal. red.) [i insh.]. – Mn. : BelTA, 2001. – Kn. 2. – 641s.

13. Pamyats’: gistoryka-dakumental’naya khronika Pruzhanskaga raena / redkal.: I. P. Shamyakin (gal. red.) [i insh.] ; mast. A. M. Khil’kevich. – Mn. : BelEn, 1992. – 245 s.

14. Dzyarzhauny arkhiu Brestskai voblastsi. – F. 1. Vop. 26. Spr. 3113.

15. Savich, A. A. Aichynnaya gistaryyagrafiya gistoryi Zakhodnyai Belarusi 1921–1939 gadou. – Brest, 2019. – 300 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 20.02.2026*